**УДК 338.45-057.2(476)(091)"17"** **DOI 10.52928/2070-1608-2024-71-3-36-40**

# САЦЫЯЛЬНЫ ПАРТРЭТ І СТАНОВІШЧА РАБОЧЫХ ВОТЧЫННЫХ МАНУФАКТУР НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XVIII СТ.

***Я.У. МАКОЎСКАЯ***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***
***ORCID: https://orcid.org/0009-0004-9476-2520***

*Артыкул закранае пытанне працоўнай сілы на прадпрыемствах мануфактурнага тыпу, якія ўзніклі на беларускіх землях у XVIII стагоддзі. Аўтар імкнецца намаляваць падрабязны партрэт рабочага вотчынных мануфактур праз аналіз полавага, колькаснага, нацыянальнага складу працаўнікоў прадпрыемстваў. Адной з асаблівасцей мануфактур на тэрыторыі Беларусі было выкарыстанне працы прыгонных сялян, таму праблема сацыяльнага складу рабочых займае асобнае месца ў артыкуле. Падчас усебаковага разгляду партрэта працоўнага немалаважным з'яўляецца і пытанне нацыянальнасці. У артыкуле не толькі пералічваюцца нацыянальнасці працоўных, але і робіцца выснова аб прычынах хуткай замены замежных майстроў мясцовымі спецыялістамі. Асаблівая ўвага надаецца апісанню і ацэнцы умоў, у якіх працавалі рабочыя.*

***Ключавыя словы:*** *вотчынныя мануфактуры, працоўныя, прыгонныя рабочыя, наёмныя працоўныя, Налібоцкая шкляная мануфактура, Нясвіжская тэкстыльныя мануфактура.*

**Уводзіны.** У сярэдзіне XVIII ст. на беларускіх землях узнікаюць новыя прадпрыемствы, асаблівасцю якіх стала актыўнае выкарыстанне падзелу працы. Мануфактуры былі вядомы ў Еўропе яшчэ з XIV ст., але на тэрыторыі Беларусі яны з'явіліся значна пазней і мелі шэраг рэгіянальных асаблівасцей. Артыкул прысвечаны выяўленню асноўных характарыстык працоўнай сілы на вотчынных мануфактурах у XVIII ст. Мэтай артыкула з'яўляецца стварэнне ўсебаковага патрэта рабочага вотчынных мануфактур, для чаго даецца характарыстыка колькаснага, полавага, нацыянальнага і сацыяльнага складу працоўных. Пытанне супрацоўнікаў фабрык і заводаў у беларускай гістарычнай навуцы распрацавана добра, а вось інфармацыя аб іх папярэдніках – рабочых мануфактур – прадстаўлена довалі сціпла. Найбольш інфармацыйнай па гэтым пытанні з'яўляецца манаграфія М.Т. Раманоўскага "Развіццё мануфактурнай вытворчасці ў Беларусі" [1], у якой ўсебакова разглядаецца дзейнасць мануфактур, не магчымая без аналізу працоўнага складу прадпрыемстваў. Шэраг звестак аб складзе і стане працоўных утрымліваюць працы М. Яніцкай, В. Школьнай, В. Кулі [2–4], прысвечаныя дакладным мануфактурам. Дапоўніць карціну можна з дапамогай архіўных крыніц з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і зборнікаў дакументаў [5–9].

**Асноўная частка.** Вотчынныя мануфактуры для сучаснага прадпрымальніка не вылучаюцца значнасцю памераў, але ў XVIII ст. яны ўяўлялі сабой сапраўдную эканамічную адзінку. У сярэднім, склад працаўнікоў вотчыннай мануфактуры на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага складаўся з 40–50 чалавек. Менавіта такой была шкляная мануфактура ў Налібаках – першае прадпрыемства мануфактурнага тыпу на беларускіх землях. У часы росквіту (1760 – 1790-я гг.) тут налічвалася каля 48 пастаянных працоўных. Справаздача аб стане шкляной мануфактуры за 1765 г. дае магчымасць гэта праверыць. Так, на прадпрыемстве ў азначаны год працавалі інтэндант, 2 пісары, 7 майстроў-гутнікаў, 1 майстр па вырабу лістоў, 8 іх вучняў, 5 шліфоўшчыкаў, 8 рысоўнікаў, 2 слесары, 3 сталяры, 2 паташнікі, 2 кавалі і 2 іх вучні, 1 ганчар, 2 токары, 4 апальшчыкі і 2 дапаможныя рабочыя – усяго 52 рабочых [10, с. 103; 7, с. 26–266].

Сустракаліся і значна больш сціплыя мануфактуры. Прыкладам прадпрыемства, невялікага па колькасці працоўных, можа быць фаянсавая мануфактура ў Свержані. Агульная колькасць яе рабочых складала каля 20-25 чалавек. І гэта ўлічваючы той факт, што прадпрыемства такога тыпу ў галіне вырабу посуду прадугледжвае наяўнасць вялікай колькасці розных спецыялістаў – ганчара, цясляра, мастака, кафельніка і інш. [3, с. 57].

Вельмі рэдкай з'явай былі буйныя вотчынныя мануфактуры. Да ліку такіх прадпрыемстваў можна аднесці шкляную мануфактуру князёў Радзівілаў у населенным пункце Урэчча. Асартымент мануфактуры быў вельмі шырокі. Тут выраблялі не толькі шкляны посуд, але і люстэркавае шкло, якое давала магчымасць ствараць мэблю з люстэркамі, асвятляльныя прыборы і іншыя прадметы раскошы, што непасрэдна ўплывала на колькасць персанала. Нягледзячы на той факт, што колькасць майстроў на Урэцкім "заводзе" ў розныя часы вагалася, яна заўсёды складала больш за 40 працоўных, а ў часы росквіту перавышала 60 рабочых [1, с. 51; 8, с. 22–32].

Даволі складаным у вывучэнні з'яўляецца полавы склад вотчынных мануфактур. У крыніцах жаночыя імёны і прозвішчы не сустракаюцца, але гэта не дае магчымасці сцвярджаць, што вотчынныя мануфактуры абслугоўваліся толькі мужчынскай працай. Дакладна вядома, што на Нясвіжскай тэкстыльнай мануфактуры на працу па вытворчасці нітак (прадзільшчыцамі) набіраліся мясцовыя маладыя жанчыны. Ва ўсіх крыніцах гэтая катэгорыя працаўнікоў фігуруе пад назвай "дзяўчаты". З квот на колькасць работніц, выпрацаваных для суседніх населеных пунктаў, можна падлічыць колькасць прадзільшчыц на прадпрыемстве – 37 чалавек [4, с. 53–54]. Калі ўзгадаць агульную колькасць працаўнікоў на момант пачатку працы Нясвіжскай мануфактуры, якая была каля 60 чалавек, то вызначым, што жанчыны на тэкстыльным прадпрыемстве складалі не менш за 61% ад агульнай колькасці працоўных. У іншай папулярнай галіне для вотчынных мануфактур XVIII ст. – шкларобнай – жанчын-

працаўніц аўтарам не выяўлена. Гэта дае падставу выказаць меркаванне аб выкарыстанні жаночай працы ў тых галінах вытворчасці, дзе яна была запатрабавана: у большасці сваёй, на тэкстыльных прадпрыемствах.

Нацыянальны склад першых вотчынных прадпрыемстваў быў вельмі стракаты. Заснавальнікі першых вотчынных мануфактур мелі даволі абмежаваныя веды наконт асаблівасцей арганізацыі вытворчасці і таму імкнуліся адшукаць спецыялістаў, якія дапамогуць наладзіць і запусціць працэс. І на Налібоцкай, і на Урэцкай ноавутвораных мануфактурах першымі майстрамі сталі запрошаныя з-за мяжы спецыялісты. Так, на Налібоцкай мануфактуры працавалі Вольфганг Ландграф з Баварыі, Ёган Рэпц, Георг Хайнц, Крыстоф Дрэер і Георг Унгер з Саксоніі. Кожны з іх быў сапраўдным прафесіяналам у шкларобнай справе: Георг Хайнц быў знаўцам хрусталю, Крыстаф Дрэер адказваў за роспіс вырабаў, а Георг Унгер – за шліфаванне. Кіраўніком новаўтворанага прадпрыемства быў прызначаны француз Канстанцін Францішак Фрэмель, на плечы якога і была ўскладзена задача арганізацыі працы прадпрыемства [11, с. 64].

З цягам часу замежных майстроў замянялі мясцовыя. Даследчыкі бачаць прычыну гэтага ў эканамічных выгодах. Заробкі, выплочваемые замежным спецыялістам, былі ў некалькі разоў вышэйшыя за грошы, якія атрымлівалі мясцовыя прафесіяналы. Напрыклад, у дакуменце “Табеля, реестры натуральной и денежной платы…” фігуруе агульная сума заробка іншаземных майстроў на Урэцкай мануфактуры ў 1740-я гг.: за год працы яна склала 25,360 злотых [5]. Пазнейшы дакумент “Ведомости о состоянии стеклянной Урецкой фабрики…” апісвае працу гэтага ж прадпрыемства, але за 1802 г., калі замежных майстроў на прадпрыемстве ўжо не было. На выплату заробкаў усім працоўным было выдаткавана 1.810 руб. 10 коп. [8, с. 32]. Акрамя таго пражыванне замежных майстроў, а часам і харчаванне, арганізоўвалася наймальнікам.

Да 50-х гг. XVIII ст. амаль усіх замежных працаўнікоў замянілі мясцовыя спецыялісты. Вышэйзгаданая справаздача аб стане Налібоцкай мануфактуры ўтрымлівае выключна мясцовыя прозвішчы працоўных. Так, на шкляной мануфактуры ў 1765 г. гутнікамі працавалі Марцін Мішук, Мікалай Собаль і інш., пасаду рысоўнікаў займалі Ігнацій Дубіцкі, Рыгор Клімовіч, Адам Навіцкі і інш. Кіруючыя пасады прадпрыемства таксама займаюць прадстаўнікі мясцовай шляхты: суперінтэндантам прадпрыемства на момант справаздачы з’яўляўся пан Чачот, а функцыі пісара выконвалі Сямён Федаркевіч і Ігнацый Бояжынцэвіч. Мясцовае паходжанне працаўнікоў, акрамя іх імёнаў і прозвішчаў, можа пацвердзіць інфармацыя аб родным населеным пункце майстра. У справаздачы ўсе працаўнікі, якія маюць інфармацыю аб населеным пункце, родам напасрэдна з Налібакаў ці суседніх вёсак – Пруды, Янкавічы, Агароднікі, Несцяровічы і інш. [7, с. 265-266]. Шэраг прозвішчаў сустракаецца ў крыніцах цягам шматлікіх гадоў, што дае магчымасць сцвярджаць аб працы на вотчыных прадпрыемствах цэлых сем’яў, прадстаўнікі якіх былі патомнымі ткачамі, гравёрамі, мастакамі і г.д. Самымі вядомымі сем’ямі былі Дубіцкія, Малевічы, Маджарскія, Сільвестровічы, Рымашэўскія і іншыя [2, с. 41]. Перавага мясцовага элемента ў нацыянальным складзе вотчынных прадпрыемстваў захаваецца да моманту закрыцця мануфактур. “Ведомость расчётов с рабочими и служащими стекольного завода в Уречье…” за 1802–1803 гг. узгадвае такія імёны майстроў як Казімір Дашкевіч, Мікалай Рымашэўскі, Бенедыкт Дубіцкі, Казімір Сільвестровіч, Кжыстоф Александровіч, Рыгор Петровіч, Філіп Урбановіч і шмат інш. [6, арк. 6-32].

Характэрнай рысай вотчынных мануфактур на беларускіх землях у XVIII ст. з’яўляецца актыўнае выкарыстанне працы прыгонных, якая фактычна была бясплатнай, што аўтаматычна рабіла ўтрыманне прадпрыемства справай больш чым выгаднай. Выкарыстанне працы прыгонных сялян на мануфактурах – дакументальна пацверджаны факт. У А.М. Карпачова чытаем: «По данным инвентарей этих деревень 1789 г., крестьяне Нивок обязаны были отработать в течении года в порядке обслуживания гуты 1,454 дня “пеших”, крестьяне Налибок – 1,872 дня “упряжных” » [10, с. 110]. Для Урэцкага прадпрыемства сяляне “набіраліся” з вёсак Дарасін, Урэчча, Языль і іншых суседніх. Квота на 5 вёсак у 1775 г. складала 21,696 дзён [1, с. 52]. Часцей за ўсё прыгонным сялянам даручалася работа, дзе не вельмі патрэбныя нейкія спецыфічныя навыкі і ўменні, напрыклад, нарыхтоўка дроў, падвоз сыравіны і харчу, дагляд за канямі, ахова прадпрыемства, рамонт абсталявання, будаўнічыя працы і іншыя заняткі. Выконваць даручаную працу было іх абавязкам (спецыфічны від баршчыны), узнагароду за які яны не атрымлівалі. Прыблізныя лічбы па колькасці прыгонных нам дае Нясвіжскае тэкстыльнае прадпрыемства, дзе праца дзяўчат-прадзільшчыц была прымусовай. Загад княжацкай канцылярыі за верасень 1752 г. накладваў спецыфічны абавязак па наборы такіх працаўніц на Мірскага, Карэліцкага і Нясвіжскага адміністратараў. У ім жа былі ўсталяваныя квоты: Карэлічы павінны былі пастаўляць 20 дзяўчат, Олталеж (сучасны беларускі эквівалент невядомы) – 7 (трошкі пазней – па 5), астатнія 12 набіраліся с Нясвіжа і бліжэйшых вёсак. Усяго 39, пазней 37 чалавек. Дзяўчаты павінны былі адпрацаваць адзін квартал (3 месяцы), пасля чаго іх змянялі іншыя. Калі хто-небудзь з работніц збягаў, населены пункт быў абавязаны замяніць яе [4, с. 53–54]. Такім чынам, калі не ўлічваць дадатковых працоўных (3-4 чалавекі), якія таксама маглі прызначацца з ліку прыгонных, то атрымаецца, што на Нясвіжскай вотчыннай мануфактуры з 60 работнікаў, як мінімум, 37 былі прыгоннымі дзяўчатамі, што складае 61% ад агульнай колькасці. Трэба ўлічваць, што гэта спецыфічная сітуацыя, характэрная для тэкстыльных прадпрыемстваў, якія маглі сабе дазволіць актыўна выкарыстоўваць нізкакваліфікаваную працоўную сілу, чаго нельга сказаць пра таксама папулярную ў той час вытворчасць шкла ці фаянсу.

Побач з прыгоннымі сустракаліся і людзі вольныя, інфармацыі аб іх у дакументах захавалася шмат. Галоўны маркер незалежнасці майстра ад уладальніка прадпрыемства – рэгулярна выплачваемы фіксаваны заробак грашыма. У першую чаргу ў катэгорыю наёмных працоўных трапляюць усе замежныя спецыялісты, аб якіх размова вялася

вышэй. З цягам часу іх замянілі майстры, якіх набіралі з ліку мясцовых рамеснікаў ці асобы, якіх самастойна рыхтавалі на самой мануфактуры. Часцей за ўсё, мясцовыя майстры былі прадстаўлены збяднелымі шляхціцамі і мяшчанамі суседніх населеных пунктаў (Нясвіж, Свержань, Налібокі, Янкавічы, Урэчча і інш.) [2, с. 41].

Людзі вольныя, як правіла, мелі мінімальную адукацыю, а таксама магчымасць і жаданне навучацца далей. Такая катэгорыя як “вучні” фігуруе ва ўсіх справаводчых дакументах вотчынных мануфактур. Прапановы аб іх вольным статусе небеспадстаўныя: у адным з рапартаў да князя Радзівіла кіраўнік Нясвіжскай тэкстыльнай мануфактуры Язэп Весел піша, што безвынікова шукае хлопцаў на працу, такім чынам, яны не прызначаюцца прымусова. Яшчэ адзін дакумент, які датычыцца Свержанскай мануфактуры, кажа аб ўцёках аднаго з хлопцаў-вучняў дамоў у ліпені 1749 г. з-за збіцця на працоўным месцы. Па справе было праведзена цэлае расследаванне, па выніках якога быў складзены рапарт. Гэтая падзея не была пакінута без увагі, вучні відавочна мелі больш высокі статус, чым іх прыгонныя калегі. Некаторыя даследчыкі лічаць, што пазіцыя вучняў была самай удалай, бо да іх адносіліся як да добрага ўкладання ў будучыню мануфактуры, ад якога ў далейшым будзе залежыць яе прыбытак. Адносіны да іх былі ўважлівыя і клапатлівыя, што фіксуецца ў дакументах з рэкамендацыямі і наказамі наконт дзейнасці прадпрыемства, накіраваных ад уладальніка мануфактуры да яе кіраўніка. У інструкцыях, дадзеных інтэнданту нясвіжскай тэкстыльнай мануфактуры, спадару Веслу, рэкамендавалася паводзіць сябе з працаўнікамі “як мага сціпла, каб заахвочваць іх да работы” [4, с. 51–52].

Плюсы выкарыстання працы наёмных працоўных – прафесіянальных рабочых, зацікаўленых у выніках сваёй працы, – кіраўнікі мануфактур заўважылі амаль адразу. Ужо ў XVIII ст. на некаторых вотчынных прадпрыемствах імкнуліся адыходзіць ад выкарыстання прыгонных працоўных і пераходзіць на добраахвотную працу вольных рабочых. Вядома, што падчас кіраўніцтва нясвіжскай тэкстыльнай мануфактурай Пётр Тапалеўскі выказваў настойлівае жаданне адмовіцца ад чарговай штоквартальнай працы дзяўчын-прадзільшчыц і перайсці да пастаяннай працоўнай занятасці, што павінна было павысіць майстэрства дзяўчын, і, адпаведна, прывесці да павышэння якасці і колькасці вырабляемай прадукцыі [4, с. 65].

Прывеліяванае становішча вольных майстроў падкрэслівалася рэгулярным заробкам. Аплата працы залежала ад шматлікіх фактараў: віда працы, кваліфікацыі і таленавітасці майстра, колькасці выробленай прадукцыі, сямейнага становішча майстра і іншых момантаў. На ўсіх вотчынных мануфактурах былі катэгорыі працаўнікоў, якія атрымлівалі фіксаваны заробак. Вядома, да такіх адносіліся кіраўнік, пісары, вучні, усе дапаможныя працоўныя (кавалі, ганчары, столяры і г.д.). Самымі заможнымі працаўнікамі з пералічаных, безумоўна, з’яўляліся кіраўнікі мануфактур, іх гадавы заробак перавышаў 300 злотых. Спадар Чачот (інтэндант Налібоцкай мануфактуры) атрымліваў 400 злотых у год. Пісары на прадпрыемствах таксама зараблялі добрыя грошы. Так, на Налібоцкай мануфактуры ў 1765 г. аклад пісара складаў 288 злотых у год (24 злотых у месяц). Заробак дадатковых працаўнікоў залежаў ад складанасці выконваемай работы і розніўся ад 144 злотых (мог атрымліваць слесар) да 16 злотых штогадова (атрымліваў апальшчык). Вучні таксама атрымлівалі грошы незалежна ад аб’ёма выкананай працы, але ў залежнасці ад сваёй спецыялізацыі. Вучні-гутнікі ў сярэднім атрымлівалі каля 8 злотых у месяц (96 злотых у год) [7, с. 265–266]. Калі ўлічваць, што пуд (трохі больш за 16 кг) самага таннага жыта ў Гданьску ў 1760 г. можна было набыць за 21 грош, то заробкі працаўнікоў мануфактурных прадпрыемстваў не падаюцца вельмі нізкімі [9, с. 60].

Асноўная маса працаўнікоў (гутнікі, ткачы, рысоўнікі, гравёры і г.д.), працу якіх лёгка было палічыць і ацаніць, атрымлівала заробак у залежнасці ад аб’ёму выкананай працы. На шкляных прадпрыемствах была ўсталявана фіксаваная аплата 1 капы (60 шт.), якая складала 20 грошаў. Найбольш вопытныя і кваліфікаваныя майстры маглі разлічваць на 25 грошаў за капу. Асабліва каштоўныя майстры (шліфоўшчыкі і рысоўнікі) атрымлівалі 1/3 ад кошта кожнага выраба [7, с. 265-266]. Заробкі кваліфікаваных майстроў за год былі прыблізна наступныя: замежныя майстры – ад 400 да 1360 злотых у год, каваль – 156 злотых, гутнікі, шліфоўшчыкі – ад 76 да 45 злотых, паліроўшчыкі – ад 60 да 45 злотых [10, с. 111–112].

Лепш зразумець, якім коштам даставаліся рабочым гэтыя грошы, можна разгледзеўшы ўмовы іх працы. Справаводчыя дакументы, якія захаваліся на сённяшні дзень, даюць небагатае апісанне працоўнага асяроддзя на вотчынных прадпремствах. Вядома, што ў абсалютнай большасці ўстаноў працоўны дзень перавышаў 10 гадзін. З улікам светлавога дня імкнуліся пачаць працу як мага раней, з 4 гадзін раніцы і заканчвалі каля 7 гадзін увечары. Нават з перапынкам на абед працоўныя праводзілі за працай каля 13–14 гадзін шэсць дзён у тыдзень [1, с. 52]. І гэта ўлічваючы, што амаль уся праца патрабавала фізічнай сілы і трываласці. Дарэчы, вельмі часта такі доўгі працоўны дзень не вызываў наракання ў працаўнікоў. Гэта звязана з аплатай працы вольных майстроў, якія атрымлівалі заробак у залежнасці ад аб’ёму выкананай працы. Вядома, што разлік з майстрамі Слуцкай персіярні ажыцяўляўся ў суботу, калі кожнаму майстру аплочвалі той кавалак працы, які ён здолеў зрабіць за тыдзень [12]. Такім чынам, у інтарэсах саміх майстроў было вырабіць як мага большы кавалак працы.

Большасць прадпрыемстваў характаразавалася жорсткай дысцыплінай. Так, спазненне на працу ці ранейшы зыход з яе караліся ў залежнасці ад статуса парушальніка на прадпрыемстве. Напрыклад, некваліфікаваных працаўнікоў маглі збіць палкамі ці пакараць турэмным зняволеннем, для майстроў жа былі прадугледжаны штрафы (напрыклад, памер штрафа на Налібоцкай мануфактуры складаў 20 грошай за кожную гадзіну спазнення). Падчас працы нельга было рабіць перапынкі, хадзіць па цэху, спяваць і шумець [1, с. 44–63]. Аб неспрыяльных умовах працы кажуць зафіксаваныя ў дакументах скаргі і нават уцёкі з працы. Таксама вядома, што ў неспакойны

час другой паловы XVIII – пачатку XIX ст. ў Налібаках стаяў вайсковы гарнізон. Ці то каб абараняць мануфактуру ад бандытаў, ці то каб пільнаваць працаўнікоў [11, с. 67].

**Заключэнне.** Больш-менш поўны разгляд пытання працоўнай сілы вотчынных мануфактур прадугледжвае аналіз нацыянальнага, полавага, колькаснага, сацыяльнага складу працаўнікоў прадпрыемстваў.

У другой палове XVIII ст. на беларускіх землях па колькасці працоўных мануфактуры былі дробныя (мелі 20–25 працоўных), сярэднія (абслугоўваліся 40–50 чалавекамі) і буйныя (выкарыстоўвалі працу больш за 50 рабочых). У полавым складзе на прадпрыемствах пераважалі мужчыны, але былі галіны вытворчасці (напр., тэкстыльная), дзе адсотак жанчын-працаўніц быў даволі высокі. Калі аналізаваць нацыяльны склад працаўнікоў мануфактур на беларускіх землях, то ўсіх спецыялістаў умоўна можна падзяліць на замежных і мясцовых. У першыя гады існавання мануфактур на іх пераважаў іншаземны элемент, але ўжо к сярэдзіне XVIII ст. яго выцеснілі мясцовыя працоўныя кадры, праца якіх была не такой таннай, але не менш якаснай. Такая сітуацыя замацуецца і будзе захавана ўвесь час дзейнасці вотчынных прадпрыемстваў. На мануфактурах працавалі як прыгонныя, так і свабодныя спецыялісты, прычым не заўсёды прыгонных было больш. Колькасць вольных рабочых залежала ад складанасці вытворчасці. Чым больш ведаў і адукацыі патрабавалася для працы, тым большы адсотак свабодных спецыялістаў набіраўся ў штат. Такая сітуацыя была характэрна для шкляной вытворчасці. Кіраўніцтва мануфактур даволі хутка ўбачыла такія выгоды ад наёмных рабочых, як адукаванасць, прафесіяналізм, зацікаўленнасць у колькасці і якасці вырабленага. Ад працы прыгонных не адмаўляліся, але ў большасці сваёй яе выкарыстоўвалі для выканання некваліфікаванай працы. Умовы працы работнікаў мануфактур былі цяжкімі: працяглы працоўны дзень, штрафы і пакаранні, не заўсёды здавальняючы стан працоўных памяшканняў, адсутнасць дапамогі падчас хваробы ці старасці. Больш-менш добра сябе маглі адчуваць толькі вольныя прафесіяналы. Нягледзячы на шматлікія цяжкасці, працоўным вотчынных мануфактур удавалася ствараць унікальныя вырабы неверагоднай прыгажосці, узбагаціўшыя дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Романовский Н.Т. Развитие мануфактурной промышленности в Белоруссии (вторая половина XVIII – первая половина XIX ст.). – Минск: Ротапринт НИ при Госплане БССР, 1966. – 431 с.
2. Яніцкая М.М. Беларускае мастацкае шкло (XVI – XVII стст.). – Мінск: Навука і тэхніка, 1977. – 87 с.
3. Школьна О.В. Великосвітські мануфактури князів Радзивіллів XVIII-XIX століть на теренах Східної Європи. – Київ: Ліра-К, 2018. – 191 с.
4. Kula W. Szkice o manufakturach w Polsce XVIII wieku. Cz. 1 – 2: 1720 – 1780. – Warszawa: Panstwowe Wydawnictwo Naukowe, 1956. – 448 s.
5. Табеля, реестры натуральной и денежной платы, тарифы месячного, квартального, годового жалованья администрации и рабочим зеркальной фабрики имения // Национальный исторический архив Беларуси. – Ф. 694. Оп. 2. Д. 9004.
6. Ведомости расчётов с рабочими и служащими стекольного завода в Уречье с указанием выроботанных изделий // Национальный исторический архив Беларуси. – Ф. 694. Оп. 2. Д. 9028.
7. Из отчета о состоянии стекольной мануфактуры кн. Радзивиллов в с. Налибоки // Сборник документов и материалов Белоруссия в эпоху феодализма: у 3 т./ рэдкал.: А. И. Азаров, А. М. Карпачев [и др.]. – Минск: Академия наук БССР, 1960. – Т. 2: Белоруссия в эпоху феодализма с середины XVII до концаXVIII века, до воссоединения с Россией. – С. 264 – 266.
8. Матэрыялы да гісторыі мануфактуры Беларусі ў часы распаду феадалізму / Беларуская акадэмія навук, Інстытут гісторыі імя М.Н. Пакроўскага. – Мінск: Выдавецтва Беларускай акадэміі навук, 1934. – № 1: [1796-1840]. – С. 22–32.
9. Рост цэн на збожжа // Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі: у 4 т. / рэдкал.: Н.М. Нікольскі [і інш.]. – Мінск: Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1940. – Т. 2 (1772-1903 гг.). – С. 60.
10. Карпачев А.М. О социально-экономической сущности вотчинной мануфактуры // Вопросы истории. – 1957. – № 8. – С. 101–117.
11. Галоўка С. Шкляныя цуды з Налібакаў // Беларуская думка. – 2016. – № 10. – С. 60–67.
12. “Я карандашом не нарисую то, что получалось, когда они нажимали на педаль”: как ткали слуцкие пояса в 18 веке и что изменилось сейчас [Электронный ресурс] // СТВ. ЗАО “Столичное телевидение”. – 22.05.2018. – URL: http://www.ctv.by/ya-karandashom-ne-narisuyu-to-chto-poluchalos-kogda-oni-nazhimali-na-pedal-kak-tkali-sluckie-poyasa (дата обращения 10.01.2024).


*Паступіў 12.02.2024*

# СОЦИАЛЬНЫЙ ПОРТРЕТ И ПОЛОЖЕНИЕ РАБОЧИХ ЧАСТНОВЛАДЕЛЬЧЕСКИХ МАНУФАКТУР НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В XVIII В.

***Я.В. МАКОВСКАЯ***
***(Белорусский государственный университет, Минск)***

*Статья затрагивает вопрос рабочей силы на предприятиях мануфактурного типа, которые возникли на белорусских землях в XVIII веке. Автор стремится нарисовать подробный портрет рабочего частновладельческих мануфактур через анализ полового, количественного, национального состава рабочих предприятий. Одной*

*из особенностей мануфактур на территории Беларуси было использование труда крепостных крестьян, поэтому проблема социального состава рабочих занимает особое место в статье. Во время всестороннего рассмотрения портрета рабочего немаловажным является вопрос национальности. В статье не только перечислены национальности рабочих, но и делается вывод о причинах быстрой замены иностранных мастеров местными специалистами. Особое внимание уделяется описанию и оценке условий, в которых трудились рабочие.*

***Ключевые слова:*** *частновладельческие мануфактуры, рабочие, крепостные рабочие, наёмные рабочие, Налибокская стеклянная мануфактура, Несвижская текстильная мануфактура.*

## SOCIAL PORTRAIT AND POSITION OF WORKERS OF PATRIMONIAL MANUFACTORIES IN THE TERRITORY OF BELARUS IN THE 18TH CENTURY

***Y. MAKOUSKAYA***
***(Belarusian State University, Minsk)***

*The article is devoted to the problem of working force in manufacturing-type enterprises that arrived on Belarusian lands in the 18th century. The author strives to paint a detailed portrait of the worker in patrimonial manufactories through an analysis of the gender, quantitative, and national composition of workers in enterprises. One of the features of manufactories on the territory of Belarus was the use of the labor of serfs, therefore the problem of the social composition of workers occupies a special place in the article. During a comprehensive examination of the portrait of a worker, the issue of nationality is important. The article not only lists the nationalities of the workers, but also makes a conclusion about the reasons for the rapid replacement of foreign craftsmen by local specialists. Particular attention is paid to the description and assessment of the conditions in which the workers worked.*

***Keywords:*** *patrimonial manufactories, workers, serf workers, hired workers, glass manufactory in Nalibaki, Nesvizh textile manufactory.*